Энцыклапедыя прыроды Беларусі. - 1986. - Т. 5. - С. 103.
А. С. Шалапёнак, А. Р. Александровіч

ТРУБКАКРУТЫ (Attelabidae), сямейства жукоў. Каля 1300 відаў; пашыраны пераважна ў трапічных лясах. У СССР каля 100 відаў, з іх на Беларусі вядома каля 20. Шкоднікі лясных і пладовых дрэў і кустоў (дуба, бярозы, таполі, ляшчыны, слівы, вішні і інш.). Развіваюцца ў тканках раслін, якія марудна завядаюць або гніюць. У лясах Беларусі прычыняюць нязначную шкоду з-за невял. колькасці. Часцей трапляюцца Т. арэшнікавы (*Apoderus coryli*), Т. дубовы (*Attelabus curculionides*), Т. таполевы (*Byctiscus populi*). У садах шкодзяць *букарка*, слонікі вішнёвы (*Rhynchites auratus*), слівавы (*R. cupreus*). Меры барацьбы: апрацоўка садоў інсектыцыдамі ў перыяд распускання пладовых пупышак і пасля цвіцення, рэгулярны збор і знішчэнне ападу.

Т. вонкава падобныя да *даўганосікаў*. Цела жукоў (даўж. 2,5—9 мм) яркае — чорнае, чырвонае, сіняе, нярэдка з метал. бляскам. Галава выцягнута ў галаватрубку. Хабаток тоўсты, сагнуты. Вусікі булавападобныя. 11- або 12-членікавыя. Брушка шырокае. кароткае. Надкрылы амаль чатырохвугольныя, не прыкрываюць канец брушка. Крылы развітыя. Лічынкі бязногія, белыя, С-падобна выгнутыя. Паводле спосабу адкладання яец Т. падзяляюцца на 2 біял. групы: самкі 1-й групы прагрызаюць ямку ў сакаўных тканках маладых парасткаў, пупышак, пладоў і адкладваюць туды яйцы. Самкі 2-й групы адкладваюць яйцы ў тканкі ліста, прагрызаюць яго па складанай крывой і скручваюць у трубку (адсюль назва), дзе развіваецца лічынка. Акукліваюцца ў глебе, маладыя жукі паяўляюцца вясной.

Літ.: Тер-Минасян М. Е. Attelabidae — Трубковерты.— У кн . Определитель насекомых Европейской части СССР. Т. 2. Жесткокрылые и веерокрылые. М.; Л., 1965

Трубкакрут арэшнікавы і скручаны ім ліст.